## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ
## ФАКУЛЬТЭТ ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ
## КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І МУЗЕЯЗНАЎСТВА

**Напрамак "культурная спадчына і турызм"**

ЗАПРАШАЕ ВАС АТРЫМАЦЬ ВЫШЭЙШУЮ АДУКАЦЫЮ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ, НАПРАМАК "КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА І ТУРЫЗМ"

**Падрыхтоўка кадраў** па гэтым напрамку спецыяльнасці пачалася ў 2012 годзе. Зместам яго з'яўляецца вывучэнне гісторыі і геаграфіі турызму, арганізацыі і эканомікі турызму, а таксама турыстычнага патэнцыялу Беларусі і найбольш актуальных пытанняў уключэння музеяў у турыстычную дзейнасць.

**Напрамак "культурная спадчына і турызм"** патрабуе глыбокіх і разнастайных ведаў, таму студэнты вывучаюць гісторыю Беларусі, сусветную гісторыю, гісторыю і тэорыю культуры, агульнае і рэгіянальнае краязнаўства, дадаткова да класічных замежных моў - лацінскую і польскую, а таксама спецтэрміналогію на замежнай мове.

**З трэцяга курса пачынаецца** самае цеснае знаёмства з напрамкам спецыяльнасці. Студэнты вывучаюць такія дысцыпліны як інфармацыйная дзейнасць у турызме, менеджмент і маркетынг у турызме, тэорыя і практыка экскурсійнай работы, турыстычная анімацыя, тураперэйтынг, рэклама і інфраструктура турызму, нарматыўна-прававое забеспячэнне турыстычнай і экскурсійнай дзейнасці. Тэарэтычныя веды замацоўваюцца падчас менеджарскай, экскурсійнай і іншых відаў практыкі.

**Працяг адукацыі** магчымы для тых, хто праявіць жаданне і здольнасць да навуковай дзейнасці. Для такіх студэнтаў існуе магчымасць удзельнічаць у навуковых студэнцкіх канферэнцыях, пасля заканчэння навучання паступіць у магістратуру. затым аспірантуру, абараніць кандыдацкую дысертацыю ў савеце ўніверсітэта.

**Уступныя іспыты (ЦТ):**

Беларуская (ці руская) мова;

Гісторыя Беларусі;

Усеагульная гісторыя (найноўшы час).

Тэрмін навучання на дзённай форме - 4 гады. Тэрміны прыёму дакументаў у 2015 г. - у адпаведнасці з пунктам 15 Правілаў прыёму ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Тэлефоны для даведак:**

+375 (017) 2094997 (кафедра);

+375 (017) 222 83 06 (прыёмная камісія).

Парадак і правілы прыёму на сайце ўніверсітэта.

Дні адкрытых дзвярэй на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый: 21.02.2015, 21.03.2015, 18.04.2015.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ